ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 189 (1156) НЯДЗЕЛЯ, 17-га жніўня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 30 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

НАПЯРЭДАДНІ XVI МЮД'у

Расьце рэвалюцыйная барацьба рабочай моладзі

Пад кіраўніцтвам комсамолу і компартыі маладыя рэволюцыйныя рабочыя вядуць упартую барацьбу супроць буржуазіі, за Савецкі Саюз

Наступ прадпрыемцаў на рабочую моладзь

У Нямеччыне ў сучасны момант тры з паловай мільёны беспрацоўных, у тым ліку 600 тысяч беспрацоўнай рабочай моладзі.

Ня гледзячы на ўзрастаючую патрэбу маладых беспрацоўных, буржуазны ўрад і профбюрократыя імкнуцца за лік нікчэмнай дапамогі, якая выдаецца рабочай моладзі, пакрыць дэфіцыт нямецкага дзяржаўнага бюджэту.

Сучасны ўрад Брунінга намерваецца адмяніць выдачу ўсякай дапамогі рабочым, маладзей 17 год. Існуючыя да гэтага часу ва многіх гарадох харчавальныя пункты для беспрацоўнай моладзі паступова зачыняюцца. Біржы працы прымушаюць беспрацоўную моладзь пад страхам пазбаўленьня дапамогі перакваліфікоўвацца. Буржуазія імкнецца выкараніць беспрацоўе сярод моладзі шляхам увядзеньня ўсеагульнай працоўнай павіннасьці на тэрмін аднаго году для ўсіх мужчын ва ўзросьце ад 17 да 25 год, з аплатай 40 пфэнінгаў у дзень (1 пфэнінг—каля паўкапейкі). Штогод каля 600 тысяч моладзі павінны будуць адбываць гэтую павіннасьць. Супроць гэтай захаванай мілітарызацыі рэзка выступілі нямецкая компартыя і комсамол. У працівагу буржуазіі, компартыя высунула наступныя патрабаваньні для рабочай моладзі: супроць зьніжэньня зарплаты, звыштэрміновых работ і масавых звальненьняў. За павышэньне зарплаты, увядзеньне шасьцігадзіннага рабочага дня пры захаваньні былой зарплаты. Супроць рабаўнічай дапамогі маладым беспрацоўным. Супроць працоўнай павіннасьці моладзі і прымусовай перакваліфікацыі.

Падрыхтоўка да МЮД'у ў Францыі

На працягу жніўня ў Парыжы будуць праведзены 2 сходы комсамольцаў і 1 конфэрэнцыя рабочай моладзі, прысьвечаныя падрыхтоўцы да міжнароднага юнацкага дня.

На 8-ае жніўня назначан сход комсамольцаў парыскага раёну, на якім будзе абгаварвацца пытаньне аб выкананьні дагавораў па соцыялістычнаму спаборніцтву з комсамолам СССР. Сход павінен будзе абгаварыць формы і мэтады выкананьня дагавору па соц. спаборніцтву.

На 14-ае жніўня назначан сход ударных брыгад, а на 31-ае жніўня конфэрэнцыя вытворчых ячэек комсамолу парыскага раёну.

Рабочая моладзь супроць закону аб соцыяльным страхаваньні

Цэнтральны орган комсамолу Францыі—„Авангард" паведамляе, што ў горадзе Вільфарушы (акруга РОН на поўдні Францыі) мясцовыя арганізацыі Французскай комуністычнай партыі і комсамолу наладзілі мітынг протэсту супроць новага закону аб соцыяльным страхаваньні рабочых.

Выступаўшыя прамоўцы, у тым ліку 3 актывістыя комсамольцы, рэзка выказаліся супроць новага закону аб соцыяльным страхаваньні. Рабочая моладзь, якая прысутнічала на мітынгу ў колькасьці 450 чалавек, аднагалосна, пры 5 устрымаўшыхся членах соцыялістычнага саюзу моладзі, вынесла рэзолюцыю, якая ўхваляе тактыку французскай компартыі і комсамолу.

Конфэрэнцыя рабочай моладзі ў Грэцыі

Нядаўна ў Грэцыі адбылася ўсягрэцкая 4-я конфэрэнцыя рабочай моладзі.

Конфэрэнцыя намеціла шляхі барацьбы за палепшаньне эканамічнага становішча маладых рабочых і работніц, супроць наступленьня капіталістых.

На конфэрэнцыі была выбрана дэлегацыя на 5-ы конгрэс Профінтэрну і на міжнародную конфэрэнцыю рабочай моладзі, якая, як від ма адбудзецца зараз-жа пасьля конгрэсу Профінтэрну.

Дэлегаты на ўсягрэцкую конфэрэнцыю рабочай моладзі былі абраны на сходах рабочай моладзі па прадпрыемствах.

У конгрэсе ўдзельнічалі таксама рабочыя-спортсмэны.

Кампанія па падрыхтоўцы да конфэрэнцыі была шырока выкарыстана для ўсямернага палепшаньня профсаюзнай работы сярод моладзі. У пэрыод падрыхтоўкі да конфэрэнцыі былі арганізаваны юнацкія сэкцыі ў чырвоных профсаюзах—будаўнічых, друкарскіх, гарбарных і харчовых рабочых.

МЮД--агляд ячэйковай работы

Міжнародны юнацкі дзень—баявое сьвята працоўнай моладзі ўсяго сьвету. У гэты дзень комсамольскія арганізацыі праводзяць агляд і мобілізацыю сіл рэволюцыйнага руху для расчышчых баёў з капіталізмам.

Кожная ячэйка павінна разгарнуць шырокую падрыхтоўчую работу да МЮД, дабіцца рашучага пералому ў рабоце на кожным слабым вучастку соцыялістычнай будоўлі.

Пад лёзунгам вывучэньня і практычнага пераўтварэньня ў жыцьцё ўсіх ленінскіх рашэньняў 16-га партзьезду падрыхтоўку да IX зьезду ЎсеЛКСМ павінна правесьці кожная ячэйка ў дні МЮД.

А для таго, каб мобілізаваць шырокія масы працоўнай моладзі на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады ячэйкі павінны за абмежак часу, які застаўся да 7 верасьня, праверыць усе вучасткі сваёй работы.

Як пастаўлена інтэрнацыянальнае выхаваньне, што зроблена ячэйкай ва умацаваньні міжнароднай сувязі?

Як ячэйка организуе рабочую моладзь на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінплянаў, за зьніжаньне сабекошту, якасьці продукцыі? Як здолела ячэйка паставіць ударніцтва на чале, правесьці ў жыцьцё дырэктыву—ніводнага комсамольца па-за ўдарнымі брыгадамі? Як ячэйка, змагаючыся з конкрэтнымі носьбітамі правай небясьпекі, дапамагла партыі ў яе барацьбе за генэральную лінію? Удзел ячэек ў хлебазагатоўках, уборачнай кампаніі, у барацьбе за бавоўну, сілос і шэраг іншых важнейшых фронтоў нашай будоўлі, дзе комсамольскія арганізацыі паказалі нябывалы энтузіязм, павінны быць дакладна правераны.

Усю гэтую праверку, баявы агляд патрэбна ўвязаць з пытаньнем, як сваю штодзённую практычную работу, кожны комсамолец зьвязвае з задачамі рэволюцыйнага руху, з усёй соцыялістычнай будоўляй.

К XVI МЮД кожная ячэйка павінна разгарнуць шырокую агітацыю, растлумачальную работу аб нашай пяцігодцы.

У падрыхтоўчай рабоце к МЮД ячэйка павінна выкарыстаць усе формы і мэтады работы.

Кожная ячэйка можа сьмела правесьці інтэрнацыянальны вечар, арганізаваць гурток па вывучэньню гісторыі КІМ, правесьці шэраг гутарак аб міжнародным становішчы і рэволюцыйным руху, падрыхтавацца да дэманстрацыі. На службу гурткам, вечарам, гутаркам трэба паставіць мясцовую бібліятэку (на вытворчасьці або ў клюбе. Бібліотэка падбірае літаратуру па юнацкім руху, а ў гэтыя дні ўсяляк рэкомэндуе не рабочай моладзі. Шырака павінна быць выкарыстана і насьценгазэта.

Насьценгазэта павінна паставіць на абгаварэньне рабочай моладзі пытаньні інтэрнацыянальнага выхаваньня. Выявіць удзел комсамольцаў у МОПР, праверыць, як комсамольцы і рабочая моладзь змагаюцца з нацыянальнай абмежаванасьцю, шовінізмам, антысэмітызмам; што зрабіла ячэйка конкрэтна для падшэфнай зарубежнай арганізацыі,—вось задача насьценгазэты. Праз насьценгазэту ячэйка можа правесьці збор прапановаў, як палепшыць інтэрнацыянальную работу.

К вечару комсамольцы павінны мобілізаваць усе клюбныя гурткі, драмгурток, літаратурны, харавы, гурток ІЗО і г. д. Акрамя таго, у ячэйках трэба ўтварыць ініцыятыўныя групы, брыгады па правядзеньню ўсёй падрыхтоўчай работы к МЮД.

Падрыхтоўка да вечару вядзецца не толькі ў клюбе, але непасрэдна на заводзе, у цэху. Усюды і скрозь комсамольцы павінны зьявіцца агітатарамі за лепшае наведваньне вечароў і масавы ўдзел рабочай моладзі ў дэманстрацыі. Да правядзеньня МЮД ячэйка павінна прыцягнуць і дарослых рабочых.

Вечар, які будзе праведзен у клюбе, павінен быць вынікам усёй работы. Побач з гэтым, вечар зьяўляецца штуршком для далейшага разьвіцьця работы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню.

Соцыялістычнае спаборніцтва—наш лепшы дапаможнік ў рабоце. Трэба разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва між ячэйкамі на лепшае правядзеньне XVI МЮД.

За баявую падрыхтоўку да сьвята працоўнай моладзі!

Н. К.

Кітай

Чырвоная армія наступае на Нанкін

Нанкінскія войскі пакінулі горад Чанша

ПАРЫЖ, 15. Згодна паведамленьню агенства „Гавас", з Ханькоў, нанкінскія войскі пакінулі горад Чанша (галоўны горад провінцыі Хунань). Агенства дабаўляе, што заняцьце гораду Чанша Чырвонай арміяй непазьбежна.

ЛЕНДАН, 15. Па паведамленьню агенства Рэйтэр з Шанхаю, кітайскія комуністыя, узброеныя вінтоўкамі, раскінуліся лягерам сярод узгоркаў на адлегласьці 15 міл. ад Нанкіна. Комуністыя маюць на руках чырвоныя перавязкі, паміж імі і мясцовым сялянскім насельніцтвам існуюць самыя таварыскія адносіны.

ПАРЫЖ, 15. Па паведамленьню з Ханькоў, туды прыбылі 43 чужаземныя ваенныя судны „для аховы чужаземных грамадзян".

ЛЕНДАН, 15. Ангельскія газэты выказваюць небясьпеку, што па меры набліжаньня комуністычных атрадаў Нанкін можа быць узяты чырвонымі шляхам арганізацыі паўстаньня ўнутры гораду. Лібэральная газэта „Манчэсьцер Гардыян" адзначае дысцыплінаванасьць і арганізаванасьць комуністычных войск.

V конгрэс Профінтэрну

Уступная прамова генэральнага сэкратара Профінтэрну тав. Лазоўскага

МАСКВА, 15. Учора ў калённай залі дому саюзаў адкрыўся 5-ы конгрэс Профінтэрну. Ва ўступнай прамове генэральны сэкратар Профінтэрну Лазоўскі адзначыў: „Конгрэс чырвонага інтэрнацыяналу профсаюзаў зьбіраецца ў складаных міжнародных абставінах.

10 год таму назад, калі была закладзена аснова Профінтэрну, капіталістычны сьвет, пасьля кароткага і штучнага пасьляваеннага росквіту, уступіў у пэрыод жорсткага эканамічнага крызісу. За гэтыя дзесяць год, разам з ростам Профінтэрну, расла і ўмацоўвалася першая краіна пролетарскай дыктатуры, у якой узьнік Профінтэрн,—краіна саветаў.

Міжнародная соцыял-дэмократыя, каб апраўдаць сваё здрадніцтва, зларадасна ўказвала рабочым капіталістычных краін на тыя цяжкасьці, якія прыходзілася перамагаць першай пролетарскай дзяржаве. Цэнтральным пытаньнем нашага конгрэсу,—гаворыць тав. Лазоўскі—бязумоўна, будзе пытаньне аб арганізацыі эканамічных баёў пролетарыяту. Нам патрэбна будзе на нашым конгрэсе вывучыць прычыны гэтага і сур'ёзна заняцца пытаньнем аб тым, як арганізаваць контр-наступленьне рабочае клясы".

Пасьля ўступнай прамовы тав. Лазоўскага выбіраецца прэзыдыум з 41 чалавека і сэкратарыят з 10-ці чалавек. У склад прэзыдыуму ўвайшлі т. т. Лазоўскі, Шворнік, Пятніцкі (СССР), Геккерт (Нямеччына), Комуссэ (Францыя), Том Ман (Ангельшчына) і іншыя.

З прывітаньнямі 5-му конгрэсу выступілі т.т.: Кусінен (ВККІ), Клярэс (Лацінская Амэрыка), Гарды (Цыхаакіянскі сэкратарыят), Носаў (МІОСТС) і іншыя. Бурнымі воплескамі быў спаткаены прадстаўнік крэйсэра „Профінтэрн", які запэўніў дэлегатаў у тым, што чырвонафлётцы СССР—верныя сыны сусьветнага рэволюцыйнага пролетарыяту—заўжды гатовы да абароны дасягненьняў пролетарскай рэволюцыі.

Конгрэс вітаў таксама дэлегаты ад заводаў СССР.

Моладзь—пад кіраўніцтвам Профінтэрну

Барацьба за моладзь вядзецца буржуазіяй і соцыял-дэмократыяй вельмі энэргічна.

Аднак, жорсткая эксплёатацыя моладзі ў капіталістычных краінах штурхае маладых рабочых у шэрагі рэволюцыйных профсаюзаў.

Амаль ва ўсіх краінах адбываюцца шматлікія стачкі моладзі. Маладыя рабочыя змагаюцца пад кіраўніцтвам рэволюцыйных профсаюзаў і профсаюзнай опозыцыі.

Гэта лепшы довад росту даверя пролетарскай моладзі да рэволюцыйнага профэсыянальнага руху.

Капіталістычная рацыяналізацыя ўзмацніла ролю рабочае моладзі ў вытворчасьці і тым самым—у клясавай барацьбе. Мільёны маладых рабочых стаяць зараз каля варштатаў, замяняючы значную частку дарослых рабочых. Імкнучыся скарыстаць гэта для павялічэньня сваіх прыбыткаў, буржуазія пры дапамозе соцыял-дэмократаў плаціць моладзі толькі частку зарплаты, якую звычайна атрымоўваюць дарослыя рабочыя.

Такім чынам, буржуазія і соцыял-фашыстыя даюць маладым рабочым нагляднья ўрокі клясавай барацьбы.

Адна пятая частка ўсіх дэлегатаў 5-га конгрэсу Комінтэрну складаецца з моладзі, якая абрана маладымі рабочымі ў прадпрыемствах, профтэхнічных школах, на пунктах рэгістрацыі беспрацоўных і профсаюзах.

Пасьля конгрэсу адбудзецца спэцыяльная конфэрэнцыя моладзі, каб абгаварыць важнейшыя проблемы клясавай барацьбы рабочай моладзі ва ўсім сьвеце.

Хітры манэўр „Газэты Варшаўскай"

„Паход на Кіеў „Газэта Варшаўска" называе авантурай, якая была навязана Польшчы, наперакор яе волі, вярхоўным польскім камандаваньнем"

ВАРШАВА, 15. Увесь польскі друк прысьвячае артыкулы дзесятай гадавіне адступленьня Чырвонай арміі ад Варшавы. Урадавы друк выхваляе заслугі галоўнага камандаваньня і Пілсудзкага.

„Газэта Варшавска" заяўляе:—„кампанія 20 году прынесла Польшчы рад паражэньняў на захадзе, дзе ўрэзаны польскія межы. На ўсходзе Польшча атрымала таксама горшыя граніцы, чым яна магла-б атрымаць без кіеўскага паходу".

Паход на Кіеў „Газэта Варшавска" называе авантурай, якая была навязана Польшчы, наперакор яе волі, вярхоўным польскім камандаваньнем". І вось зараз,—піша газэта,—дзесяць год пасьля „цуду на Вісьле" пачынаюць у Польшчы зноў гаварыць аб Украіне, аб загаворы супроць СССР, аб падзяленьні яго, аб крыжовым паходзе супроць СССР, аб гістарычнай місіі Польшчы і, нарэшце, аб неабходнасьці стварэньня самастойнай Украіны, якая зьверне французскім раньцэ хоць частку даўгоў Расіі.

У справе дзесяцігодзьдзя „цуда на Вісьле" польская грамада павінна сабе ўсьвядоміць, што гэтым нашэптваньням неабходна даць самы рашучы адпор. Новая кіеўская авантура была злачыннай у адносінах да Польшчы.

Вялізарны рост беспрацоўя ў Бэрліне

БЭРЛІН, 15. Апублікаваны новыя даныя а беспрацоўі. У адным горадзе Бэрліне ў канцы сьнежня 1929 г. да канца ліпеня 1930 г. колькасьць беспрацоўных узрасла на 43 проц. Колькасьць беспрацоўных, якія атрымоўваюць дапамогу, павялічылася з 221000 да 316000

Крывавыя сутычкі рабочых з фашыстымі

ПАРЫЖ, 15. Орган французскай компартыі „Юманітэ" паведамляе аб цэлым шэрагу хваляваньняў сярод беспрацоўных у Італіі.

27 ліпеня на лініі Балоньня--Фарара беспрацоўныя напалі на праходзіўшы цягнік у якім знаходзілася шмат дзяржаўных чыноўнікаў.

У той-жа дзень, у Мілане, у сувязі са зьняважаньнем аднаго з фашыстых, выслана была карная экспэдыцыя. У прадмесьці Мілана адбылася сур'ёзная сутычка паміж фашыстамі і рэволюцыйнымі рабочымі. Забіты адзін міліцыянэр-фашысты.

Комсамольскія ячэйкі, Упаўнаважаныя „Чырв. Зьмены"!

Паклапаціцеся аб своечасовым забясьпечаньні комсамольцаў „ЧЫРВОНАЙ ЗЬМЕНАЙ" ДА X-га ЗЬЕЗДУ комсамолу Беларусі

Выкрыць твар кулацкай агентуры

Самаправерка і перавыбары бюро комсамольскіх ячэек выявілі цэлы шэраг праяў правага ўхілу на практыцы, налічча ў комсамоле і ў кіраўніцтве ячэек кулацкіх элемэнтаў і іх падпявал

> **Разгорнутым масавым колгасна-вытворчым паходам, які павінен ператварыцца ў магутную баявую дэмонстрацыю ўсіх сіл, якія актыўна змагаецца за соцыялістычную перабудову вёскі, комсамол павінен пад кіраўніцтвам партыі нанесьці руйнуючы ўдар па кулацтву і яго агентуры—правых ухілістых**
>
> **ЦК УсеЛКСМ.**

КУЛАЦКІМ ПРЫХВАСЬНЯМ НЯМА МЕСЦА У КОМСАМОЛЕ!

Кулацкія „паўпрэды“ дзейнічаюць

Падкулачнік Кастрыца і кампанія развалілі ячэйку, а райком чакаў перавыбараў

Нарэшце ў чацьверты раз удалося сабраць і правесьці сход комсамолу па перавыбарам бюро Свальнянскай ячэйкі ЛКСМБ пры колгасе „Чырвоны Выбаржац“.

Яшчэ ў пачатку ліпеня першы раз вызначалі сход. Тады прыехалі прадстаўнікі з РК, але ня прышлі комсамольцы. У другі раз сабраліся комсамольцы, але ня прыбылі прадстаўнікі. У трэці раз, калі і тыя і другія зьявіліся, дык ня прышоў сам сэкратар. Нарэшце, у чацьвёрты раз, сабраліся ўжо і прадстаўнікі і комсамольцы і сэкратар, але...

„Мне вам няма чаго гаварыць“...

Адмаўляючыся ад справаздачы, адказны сэкратар ячэйкі заявіў: „Няма аб чым гаварыць“. Чаму,—зразумела.— Ячэйка пачынаючы з мінулых перавыбараў нічога не зрабіла. У раёне яе дзейнасьці знаходзяцца тры колгасы „Чырвоны Выбаржац“, „Юны мір“, колгас імя Калініна і два таварыствы па грамадзкай апрацоўцы зямлі.

Ячэйка знаходзіцца пры станцыі і лясным складзе, дзе досыць рабочай моладзі. Міма ячэйкі прайшлі найважнейшыя палітычна-гаспадарчыя мерапрыемствы і кампаніі, ячэйка разлажылася і распалася. Комсамольцы, большасьць якіх серадняк, п'янствавалі. За ўвесь 1930 год ячэйка ня вырасла.

Чаму гэта так здарылася? Чаму гэта, калісьці адна з найвялікшых і лепшых у Баркавіцкім раёне, Свальнянская ячэйка так дабілася „да ручкі“? А адказ можа быць просты, чаму што...—

начале кіраўніцтва ячэйкі стаяў падкулачнік і правы ўхілісты

Заможны серадняк і падкулачнік, „комсамолец“ Кастрыца, яшчэ раней вядомы сваімі правымі настроямі, пападае ў мінулых перавыбарах у бюро, а потым становіцца адказным сэкратаром ячэйкі. Астатнія члены бюро не на многа адстаюць ад свайго сэкратара. Напрыклад, комсамолка Шамбад—настаўніца мясцовай школы, пераростак, — ня цікавілася комсамольскімі справамі, а рыхтавалася „да выхаду замуж“. Другі сябра—Савіцкі— скончыўшы сямігодку серадняк, правадыр піонэрскага атраду,—палец аб палец ня ўдарыў, каб не дапусьціць развалу ячэйкі, прымірэнча адносіўся да правых вылазак свайго сэкрэтара, развáліў піонэрскі атрад.

Сам сэкратар Кастрыца пропагандаваў, што ў нас кулакоў няма, што ў колгасы ніхто ня пойдзе, быццам у апаратах сядзяць адны бюрократы і „портфэльшчыкі“, што нам мужыкам „месца там няма“, што савецкія навучальныя ўстановы нічога добрага не даюць „мужык за плугом можа хадзіць і няпісьменным“ і г. д. і г. д.

Да апошняга часу, жывучы блізка ад колгасу, ён чамусьці не зьяўляўся членам яго. Толькі нядаўна ўвайшоўшы у колгас, стаўшы сэкратаром яго, працягваў кулацкую пропаганду аб тым, што адзіналічніку жывецца куды лепш, што ў колгасе, дзе многа гаспадароў, ня будзе парадку і гаспадарка згіне.

„Мы не хацелі рабіць „левых“ загібаў“

Ячэйка ніякага ўдзелу ня прыняла ва ўсіх палітычных кампаніях, а галоўнае—у колектывізацыі і раскулачваньні. З 14 комсамольцаў ячэйкі ў колгасы ўступіла ўсяго тры. Астатнія ня гледзячы на тое, што іх зямля мяжуецца з колгаснай зямлёй, у колгас уступаць адмаўляюцца. Комсамолец серадняк, актывісты ячэйкі—Пятрэлін—вясною ўступіў у колгас, але потым вышаў з яго. У ячэйцы яшчэ „захавалася“ дачка раскулачанага кулака пазбаўленца—Фруцкая, якая яшчэ і зараз лічыцца членам комсамолу.

Колектывізацыя праходзіла ў гэтым сельсавеце стыхійна, ніякай растлумачальнай работы не вялося. Ячэйка не прапрацоўвала дырэктывы партыі аб колектывізацыі. На пытаньне чаму комсамольцы ня ўдзельнічалі ў рабоце па колектывізацыі, сэкратар Кастрыца адказаў: „Мы не хацелі рабіць „левых“ загібаў“.

Здавалася-б, што парт'ячэйка, якая знаходзіцца тут-жа ў колгасе павінна была рэагаваць на правалы ў рабоце комсамольскай ячэйкі. Але вышла наадварот,—парт'ячэйка ліла ваду на млын гэтых прарываў. Сэкратар парт'ячэйкі, тав. Баяраў, стары комсамолец, які ўвесь час быў сэкратаром комсамольскай ячэйкі, самавольна выкрасьліў сябе з комсамольскіх сьпісаў. Ён, бачыце, комуністы і яму ўжо сорамна быць у комсамоле. Кінуўшы работу ў комсамольскай ячэйцы, ён ажаніўся з кулацкай дачкою—комсамолкай Фруцкай. Стаўшы на чале кіраўніцтва парт'ячэйкі, ён не праводзіў і не праводзіць аніякай работы. Замест сапраўднай бальшавіцкай дапамогі ў наладжваньні работы комсамольскай ячэйкі, парт'ячэйка прымацоўвае да яе беспартыйнага „служаку“ нейкага Арлоўскага, які разьвёў п'янку і карцёжную гульню з комсамольцамі.

Яшчэ некалькі фактаў...

Сэкратар Кастрыца, гэты самы кулацкі падпявала, зьяўляецца пераросткам. Некалькі раз ён імкнуўся пралезьці ў партыю. Парт'ячэйка яго прымала, але райком і акругком устрымліваліся па тэй прычыне, што ён ня ўступае ў колгас. Кастрыца піша заяву ў бюро ячэйкі аб зьняцьці з яго абавязкаў сэкратара і выключэньні яго з комсамолу. Ён пачынае праводзіць тактычныя „манэўры“, імкнучыся напужаць. І напужаў. Бюро ячэйкі пашло на вудачку і ўпрасіла Кастрыцу застацца сэкратаром з абяцаньнем пахадайнічаць дзе належыць, каб яго правялі ў партыю.

І таму сэкратар парт'ячэйкі тав. Баяраў сказаў Кастрыцы.—„ты, братка, уступі у колгас, папрацуй крыху, а потым „напэўна пройдзеш“ у партыю. Так ён і зрабіў.

Райком заняў прымірэнчую лінію

Выпадкова прыяжджалі з райкому. Былы піонэрпрацаўнік Ліпоўка добра ведаў, што сэкратар падаваў у дыплёматычную адстаўку, комсамольцы ў яго пыталіся, што рабіць, але ён махнуў рукой і адказаў:—„Да перавыбараў бюро хай папрацуе, а потым зьнімем“.

Прыяжджала і сама сэкратарша райкому—тав. Федацёнак. Гаварылі і ёй, але яна адказала: „Працуйце як-небудзь—хутка перавыбары“.

Вось што рабілі работнічкі з райкомаў замест сапраўднай барацьбы з правым ухілам і яго конкрэтнымі носьбітамі. Такія адносіны райкому мала назваць прымірэнчымі.

На сходзе па перавыбарах бюро ячэйкі поўнасьцю выявіліся прымірэнчыя адносіны ўсёй комсамольскай ячэйкі да дзеяньняў свайго сэкратара і ўсяго бюро. Калі выявіліся ўсе факты і брыгадзір АК ЛКСМБ рашуча паставіў пытаньне аб выключэньні падкулачніка і правага ўхілістага, былога сэкратара Кастрыцы, з комсамолу, дык комсамольцы большасьцю галасоў пакінулі яго ў комсамоле.

Райкому партыі патрэбна неадкладна праверыць кіраўніцтва комсамольскай організацыяй. Трэба зараз-жа прыняць належныя захады па аздараўленьню гэтай ячэйкі, трэба выгнаць з шэрагаў комсамолу правых ухілістых і прымірэнцаў да іх.

А. Усьмінскі.

Пад шыльдай комсамольца,—кулацкі агітпроп

„Філёзофы“ з Прудзішчанскай ячэйкі

Пры правядзеньні самаправеркі комсамольскай організацыі Астрашыцка-Гарадзецкага раёну выявілася, што частка комсамольскіх ячэек не праводзіла аніякай работы ня толькі ў галіне колектывізацыі пасеву ўборачнай кампаніі, у барацьбе за сілос і г. д., але нават у асобных выпадках зраслася з клясавым ворагам—кулаком.

Комсамолец Прудзішчанскай ячэйкі ЛКСМБ, ён-жа сэкратар СКСТУ, пры самаправерцы ячэйкі і справаздачы сваёй аб праробленай ім рабоце, адкрыта заявіў: **„Я добра ведаю, што жыцьцё дзе ўсё ўперад і ўперад, што неабходна вывесьці сялянства з тэй прадвечнай цемры, у якой яно знаходзілася, на новы соцыялістычны шлях праз аб'яднаньне ў колгасы і дзеля гэтага патрэбна штодзённая работа з беднатой, батрацтвам і наогул з усім насельніцтвам, за выключэньнем кулака, але гэтага я рабіць ні ў якім разе не магу“.** Комсамолец той-жа ячэйкі заяўляе, што ў колгасе няма беднякоў, серадзякоў,—там усе роўныя, альбо ў колгасе няма паншчыны: захачу буду працаваць, захачу не буду. Інакш кажучы—у колгасе не патрэбны ўнутраны распарадак, хто што захоча, тое і робіць.

Комсамольская ячэйка да гэтых выступленьняў аднеслася прымірэнча, не ацаніўшы іх як сьлед.

Гальпяровіч Г. М.

„Вы пакуль папрацуйце.. а мы будзем агітаваць!“..

У вёсцы Жорава, Сьмілавіцкага раёну організаваўся невялікі колгас, куды ўвайшло 12 бядняцкіх гаспадарак. Ніводзін комсамолец у колгас ня ўступіў. Калі старшыня колгасу запытаўся ў сэкратара ячэйкі, чаму комсамольцы ня ўступаюць у колгас, дык сэкратар адказаў: „Вы ў колгасе крыху папрацуйце, а мы комсамольцы яшчэ больш будзем агітаваць. Калі-ж мы ўступім, дык ня будзе карысьці, бо так мы лепш (?) будзем прыцягваць сялянства да колгасу“.

І колгас так-сяк цягнуў сваё існаваньне. Сяляне убачыўшы, што ніводнага з „агітатараў“ комсамольцаў у колгасе няма, што ніхто на колгас не зварочвае ўвагі, пачалі выходзіць. І нарэшце колгас распаўся. А комсамольская ячэйка ўсё працягвае „агітацыю“. Сьмілавіцкі РК комсамолу не зварочваў увагі і ніводнага разу не правяраў работы гэтай комсамольскай ячэйкі.

Асот.

Як Італія рыхтуецца да вайны з Францыяй

Імпэрыялістычная Італія ў галіне замежнай палітыкі ставіць перад сабою дзьве асноўныя задачы: з аднаго боку замацаваць і пашырыць свой экономічны ўплыў на Балканах і Бліжнім Усходзе, а з другога—вярнуць ад Францыі населеныя італьянцамі Савойю, Ніццу і Корсіку і асабліва адарваць частку францускіх колёній у Паўночнай Афрыцы і Сірыі.

На гэтай глебе паміж Італіяй і Францыяй стварыліся такія варожыя адносіны, што за апошнія гады амаль увесь час чуем гутаркі аб магчымасьці вайны паміж імі.

Францыя ператварае сваю паўднёваўсходнюю граніцу (з Італіяй) у суцэльны ланцуг умацаваньняў і апорных пунктаў у такой-жа меры, як і граніцу з Нямеччынай. Толькі гэтымі днямі газэты паведамілі аб рашэньні Францыі выдаткаваць на абарону ад Італіі 5 млрд. франкаў.

Бязумоўна, Італія не застанецца ў Францыі у даўгу. „Усё для вайны“,—асноўны лёзунг італьянскага фашызму. Ня толькі ваенная, але і ўся гаспадарчая дзейнасьць фашысцкай Італіі прыстасоўваецца да дасягненьня аднэй мэты—узмацненьня ваеннай магутнасьці. Праўда, бюджэт італьянскіх ваенных міністраў ня так раздзьмуты як францускі, але залежыць гэта выключна ад фінансавай слабасьці Італіі,

Афіцыйна Італія ўтрымоўвае сухапутную армію, якая налічвае ў параўнаньні з францускай удвая меншыя контынгенты. Але ў Італіі існуе яшчэ чатырохсоттысячная фашысцкая міліцыя. У гэтай міліцыі ёсьць атрады (па аднаму батальёну на кожную пяхотную дывізыю), якія складаюцца з профэсыяналаў, абавязаных па контракту знаходзіцца пад ружжом на працягу дзесяці год. Затым у ёй ёсьць артылерыйскія, пяхотныя, інжынэрныя, авіацыйныя і хэмічныя, марскія, падрыўныя, пагранічныя, якія спэцыяльна дрэсіруюцца для атакі і іншыя часткі. Карацей кажучы, фашысцкая міліцыя—гэта другая рэгулярная армія, утрыманьне якой пакрываецца з пазабюджэтных крыніц.

На марскі і паветраны флёты Італія траціць менш Францыі, затое сумы гэтыя выдаткоўваюцца больш рацыянальна. Італія вывела з складу свайго флёту амаль усе дрэдноуты і ўстарэлыя судны, утрыманьне якіх каштуе дорага, а карысьці вельмі проблематычна. У будаўніцтве новых суднаў яна не адстае ад Францыі. За сем апошніх год у Францыі пабудавана і пачата будаўніцтвам 224.000 тон ваенных суднаў, а ў Італіі—206.000 тон.

Падрыхтоўку да вайны італьянскія фашысты зводзяць, там дзе гэта магчыма, да стварэньня кадраў. Яны ня трымаюць вялікіх запасаў ваенных матар'ялаў, згуртоўваючы усе натугі на забясьпечаньні магчымасьці ў любы момант перавесьці галоўныя індустрыяльныя прадпрыемствы на работу для вайны. Можна без пераўвялічаньня сказаць, што ў фашысцкай Італіі разьвіваюцца толькі тыя галіны прамысловасьці, якія зьвязаны з вайною. За час фашысцкага рэжыму вытворчасьць прадпрыемстваў металічнай індустрыі паднялася ў тры разы. Вытворчасьць штучнага шоўку павялічылася ў 15 раз.

Вялізарныя сродкі трацяць фашыстыя на разьвіцьцё металюргічнай і мэханічнай індустрыі. ... далі магчымасьць капіталістым ... жаць па іх жаданьню заработную плату і за гэта патрабуюць удасканаленьня абсталяваньня ці загатоўкі другога абсталяваньня для абслугоўваньня ваенных патрэб.

У галіне ваеннага суднабудаўніцтва італьянцы таксама не адстаюць ад Францыі. За апошнія два на верфях Італіі былі пабудаваны пабіўшыя сусьветны рэкорд хуткасьці крэйсэры вашынгтонскага тыпу і паставіўшыя новы сусьветны рэкорд глыбіні пагружэньня падводныя лодкі. І зараз у Італіі будуюць ваенныя судны Грэцыя, Турцыя, Бразілія, Аргентына, Уругвай і інш.

Трэба адзначыць таксама пасьпяховасць дарожнага будаўніцтва, як ... нага для ваенных мэт. У Італіі ... большае распаўсюджваньне ... коўваюць так званыя аўтадарогі ... прызначаныя выключна для аўтамабільнай язды.

Стратэгічнае значэньне гэтых дарог—бясспрэчна, і яны палегчаць Італіі манэўраваньне між фронтам францускім і фронтам югаслаўскім.

Паход комсамолу па сілос

З ПАРОЖНІХ ЯМ СІЛОСУ НЯ ВОЗЬМЕШ

Некаторыя комсамольскія організацыі, пабудаваўшы ямы, супакойваюцца, забываючы, што ў ямах патрэбна консэрваваць кармы

Рашуча біць па опортуністых тыпу сэкратара Віцебскага РК ЛКСМБ, зрываючых выкананьне плянаў сілоснага будаўніцтва

Перадавыя організацыі, бярэце на „грамадзкі буксір“ адстаючыя раёны!

Забясьпечыць правядзеньне паходу

Усім Наркамземам саюзных рэспублік, краёвым, абласным і раённым зямкіраўніцтвам

Колгасна-вытворчы паход ленінскага комсамолу мае вялічэзнае палітычнае і гаспадарчае значэньне. Ён павінен садзейнічаць выкананьню гістарычных задач, пастаўленых XVI партыйным зьездам у справе каразнной соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі нашай краіны. Партыя і рабочая кляса дабіліся выключных посьпехаў у справе соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Посьпехі былі дасягнуты дзякуючы правядзеньню правільнай ленінскай генэральнай лініі нашай партыі і непрымірымай барацьбе з правым опортунізмам і „левымі“ загібамі ў колгасным будаўніцтве. Далейшае практычнае ажыцьцяўленьне вырашэньняў 16-га партыйнага зьезду па соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі высоўвае задачу павышэньня актыўнасьці рабочае клясы і батрацка-бядняцкіх пластоў вёскі ў справе ўмацаваньня дасягнутых посьпехаў па колектывізацыі сельскай гаспадаркі, за правядзеньне суцэльнай колектывізацыі сельскай гаспадаркі. Перш за ўсё вопыт пасьпяховай сельска-гаспадарчай работы саўгасаў і колгасаў у бягучым годзе будзе лепшым прыкладам і агітацыяй за далейшае разгортваньне колектыўнага руху, за ўцягненьне новых мільёнаў бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі ў колгасы. Вось чаму колгасна-вытворчы паход ленінскага комсамолу, які супадае з адказьнейшымі гаспадарчымі кампаніямі ў вёсцы, патрабуе прыцягненьня ўвагі ўсёй партыйнай і савецкай грамадзкасьці.

Асноўнымі задачамі колгасна-вытворчага паходу ленінскага комсамолу Наркамзем СССР лічыць:

1. Умацаваньне існуючых колгасаў і на іх падставе далейшае пашырэньне колгаснага будаўніцтва, уцягненьне новай масы сялянскіх бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі ў колгасы.
2. Барацьба за выкананьне плянавых заданьняў па асеньняй пасяўной кампаніі.
3. Барацьба за пашырэньне колгаснай жывёлагадоўлі.
4. Выкананьне задач па вырашэньню кармавай проблемы.
5. Барацьба з стратамі ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці.
6. Разьмяшчэньне пазыкі «5-годка—у 4 гады“, як адно з буйнейшых мерапрыемстваў па мобілізацыі сродкаў на індустрыялізацыю краіны і соцыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі.

Даныя Наркамзему СССР, атрыманыя з месц на 1 жніўня, гавораць аб тым, што найвялікшы прарыў застаецца ў справе практычнага вырашэньня проблемы жывёлагадоўлі. Нездавальняюча праходзяць мерапрыемствы па сілосаваньню кармоў і ўборцы траў. На 1-е жніўня, напрыклад, на паўночным Каўказе было засілосавана 0,8 проц. гадовага пляну, у Заходняй вобласьці—0,05 проц., у УССР—5,2 пр., на Сярэдняй Волзе—0,08 проц., Ніжняй Волзе—1,1 проц., ЦЧВ—1,3 проц. і Сібіру—0,8 проц. і г. д. Усё гэта абавязвае ленінскі комсамол у колгасна-вытворчы паход паставіць баявой задачай барацьбу за вырашэньне кармовай проблемы.

Выходзячы з вялізарнейшай політычна-гаспадарчай важнасьці колгасна-вытворчага паходу ленінскага комсамолу, які намечан з 15 жніўня, прапаную ўсім Наркамземам рэспублік, краёвым, абласным і раённым зямельным кіраўніцтвам аказаць усямернае садзейнічаньне ленінскаму комсамолу ў правядзеньні колгасна-вытворчага паходу.

Нам. Наркома Земляробства СССР—ЁЖАЎ.

„Будаваць сілосныя ямы яшчэ рана--пачнём увосень“

Віцебскаму прыгараднаму раёну нададзен жывёлагадоўчы ўхіл. Па пляну да 1-X па 11 колгасам статак жывёлы павінна быць даведзена да 200 галоў у кожным.

Вырашэньне проблемы жывёлагадоўлі ў гэтым раёне ўпіраецца ў недахоп кармовай базы і пакрыць гэты недахоп кармоў магчыма толькі сілосаваньнем. Але сілосу у раёне не адведзена належнае месца. Райустановы не зьвяртаюць належнай увагі на сілосаваньне.

РК ЛКСМБ на пасяджэньні бюро ад 25-у разглядаў пытаньне аб сілосаваньні і задачах комсамолу у гэтай працы. Калі-ж давялося пачаць выкананьне зьместам прапановы і як яна выконваецца, дык сэкратар РК не знаёмы апошняй, сказаў: „Пэўна даручана каму-небудзь з членаў РК напісаць і яна, мабыць, не напісана да гэтага часу“.

Так Віцебскі райком комсамолу „кіраваў“ сілоснай справай.

Опортуністы з сэкратарскім портфэлем развальваюць...

Побач з гэтым трэба адзначыць, што сэкратар райкому ЛКСМБ тав. Мойжэс, замест мобілізацыі мас комсамольцаў і кіраўніцтва на справу практычнага вырашэньня задач сілосаваньня, займаецца опортуністычнымі разважаньнямі. Ён разважае так: „Будаваць прымітыўныя сілосныя ямы і бакшты нямэтазгодна. Дзяржава павінна адпусьціць крэдыты і будаўнічы матар'ял для сілосаваньня тады можна будзе гаварыць аб пабудове сілосных траншэй і ям, а цяпер непатрэбна займацца гэтай справай“. І, як вынік гэтых разважаньняў, комсамольскія ячэйкі нічога ня робяць у галіне сілосаваньня. Сарваны курсы па падрыхтоўцы кадраў сілоснага будаўніцтва.

Складзены райштаб па сілосаваньню да сёньняшняга дня бязьдзейнічае. Нават член штабу—Бікарэвіч (ён-жа райаграном) так разважае: „Будаваць сілосныя ямы яшчэ рана,—пачнем гэтую працу ўвосень. Сілосаваць трэба толькі агароднае бацьвіньне, а іншыя расьліны і травы для сілосу не гадзяцца“.

Бюро Віцебскага РК КСМ вынесла пастанову выклікаць на соцспаборніцтва за лепшае правядзеньне сілосаваньня Гарадоцкі РК КСМ але аб гэтай пастанове ведаюць толькі сябры бюро РК. Да мас комсамольцаў гэта пастанова не даведзена і райкомы спаборнічаюць паміж сабою на паперы.

Політычна шкодныя разважаньні Бікарэвіча і праваопортуністычная ўстаноўка сэкратара РК—таварыша Мойжыса—вельмі адчуваюцца на працы ўсёй організацыі Віцебскага раёну. Вакол пытаньня сілосаваньня не мобілізованы масы, ня ўтворана грамадзкая думка і сілоснае будаўніцтва амаль зусім не распачата.

Партыйнай організацыі Віцебскага раёну патрэбна з усёй рашучасьцю ўдарыць па праваопортуністычным разважаньням, якія зрываюць працу па сілосаваньню.

Лук'яновіч.

„Слова за астатнімі“

Комсамольскія організацыі павінны сыстэматычна наладжваць інформацыю ЦК ЛКСМБ аб праробленай працы па колгасна-вытворчаму паходу (сьвінагадоўлі, сілосаваньні, уборцы ўраджаю, падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы і г. д.)

Плян сілосаваньня па раёне выканан ня будзе

Па Вузьдзенскім раёне (Менскай акрузі), павінна быць выкапана 32 ямы ёмістасьцю 1602,5 тон.

Усяго па раёне выкапана 7 ям і 1 траншэя на 30 тон масы для асеньняга сілосаваньня.

З прычыны адсутнасьці падрыхтоўчай працы па сілосаваньню з вясны і невыкананьня пляну засеву сілосных культур, плянавыя меркаваньні сілоснага будаўніцтва па раёне выкананы ня будуць.

Сэкратар РК КСМ **Баравік.**

Вырыта заступом яма глубокая...

Никитин.

Малюнак бяз слоў зразумелы,—
Зусім непатрэбны пытальнік.
Проблему хлапцы зразумелі
І... „вырашылі пытаньне“:
— Вось табе яма як трэба глыбокая...
— Вось і частуйся, мая чо павокая.

Выканалі на 60 процантаў

Рагачоўскі РК ЛКСМБ Бабруйскай акругі прапрацаваў пытаньне аб сілосаваньні на пленуме РК, намеціў практычныя мерапрыемствы ў працы, даў кожнай ячэйцы кантрольныя лічбы.

Сілосны дзесяцідзёньнік ускалыхнуў усю організацыю. Былі праведзены спэцыяльныя мітынгі і сходы з шырокім прыцягненьнем мас колгасьнікаў, пасьля якіх організоўвалі колектыўную працу па будаўніцтву ям і траншэй.

У раёне пабудавана 43 ямы і 4 траншэі. Уся праца па будаўніцтву сілосных ям у ячэйках праходзіць пад знакам разгорнутага соцыялістычнага спаборніцтва. Райкомам паслана 6 гарадзкіх брыгад на дапамогу вясковым ячэйкам.

Плян сілоснага будаўніцтва выканан на 60 проц.

За вясеньні паход організацыя дабілася засеву 51 га сілосных культур.

Сэкратар РК КСМ **Жданаў.**

З заданых 205, пабудавалі 37 ям

Па Барысаўскім раёне выкапана 37 сілосных ям і заканчваецца будаўніцтва 5 траншэй. Засілосавана 40 тон сілоснай масы.

Па раёне, згодна плянаваму заданьню, патрэбна пабудаваць 205 ям і засілосаваць 3000 тон сілоснай масы.

Па ячэйках праводзяцца суботнікі. Сэкратар РК ЛКСМБ **Крол.**

10 процантаў

Па Асьвійскім раёне, Полацкай акругі да будаўніцтва сілосных ям прыступіла 5 ячэек.

Пачалі будаваць 6 ям. Плянавае заданьне па раёне—60. Выканана 10 проц. заданьня.

Райком комсамолу, для ўзмацненьня працы па ўсіх ячэйках, накіраваў у дапамогу брыгады.

Сэкратар Р. К.

Яшчэ бяз сілосу

У Сьмілаўскім раёне пабудавана 16 сілосных ям. Да закладкі сілоснай масы ня прыступлена. Райком комсамолу заслухаў інформацыю 19 ячэек.

За апошні час адчуваецца зрух у працы комсамольскай організацыі.

Сэкратар РК ЛКСМБ.

Праўленьне колгасаў і с.-саветы зрываюць працу

Камарынскай організацыяй комсамолу выкапана 15 ям.

Праца праходзіць у надзвычайна цяжкіх умовах, бо праўленьне колгасаў і сельсаветы адносяцца нядбайна да гэтай справы, зрываючы мерапрыемствы комсамольскіх ячэек

Ячэйкі ў працы паміж сабою наладзілі соцыялістычнае спаборніцтва.

Сэкратар РК ЛКСМБ.

Кепска выконваюць заданьні

Брагінскаму раёну (Мазырскай акругі) па заданьню патрэбна пабудаваць 14 ям і 2 бакшты.

Зараз пабудавана ў саўгасах 2 ямы, адна з іх засілосавана ў 60 тон сілоснай масы, па колгасах выкапана 4 ямы і пабудавана 1 бакшта. **Сэкратар РК ЛКСМБ.**

Пра індывідуальны сэктар забыліся

Па Бабруйскім раёне пабудавана сілосных установак 45 штук, з іх у колгасах—38 і саўгасах—7. Па індывідуальным сэктары не пабудавана ніводнай ямы, ні бакшты.

Засеяна сілосных культур па колгасах—30 гектараў. З саўгасаў і індывідуальнага сэктару зьвестак няма.

Сэкратар РК ЛКСМБ—Кацярыніч

Пустымі ямамі жывёлы не накорміш

Па колгасах Койданаўскага раёну выкапана 8 ям на 240 кубамэтраў, адна траншэя на 100 кубамэтраў, 1 паўбакшта на 360 кубамэтраў і будуецца адна бакшта на 360 кубамэтраў.

Па саўгасах будуюцца дзьве ямы на 60 кб. мэтраў.

Усяго па раёне будзе засілосавана 1120 куб. мэтраў, што складае 17 проц. у адносінах пабудовы ям і 76 проц. кубатуры.

Сэкратар РК ЛКСМБ

Шырэй выкарыстаць практыку вытворчай дапамогі

Масавы выхад асобных комсамольскіх арганізацый на дапамогу колгасам па ўборцы ўраджаю садзейнічаў сваечасоваму выкананьню плянаў уборачнай кампаніі

Колгасна-вытворчым паходам комсамолу яшчэ больш узмацнім тэмпы ўборкі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы

Узаемная дапамога.

Колгас „Чырвоны Армеец" в. Пільніца, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, налічвае 10 сямей і 5 адзіночнікаў. Ня гледзячы на вялікі недахоп рабочай сілы, колгас сваечасова скончыў сяўбу і прыступіў да ўборачнай кампаніі.

Беднякі і серадняікі—неколгасьнікі в. Пільніца і Воўкаўшчына шляхам арганізацыі нядзельнікаў дапамагалі колгасу убіраць ураджай, а колгас, у сваю чаргу, дапамагаў ім машынамі.

Гявіцкі.

Дапамаглі

З наступленьнем уборачнай кампаніі ў колгасах Стара-Дворскага сельсавету, Расонскага р-ну адчуваўся значны недахоп у рабочай сіле, што пагражала зрыву кампаніі.

На дапамогу колгасам прышла комсамольская ячэйка і профсаюзы, якія наладзілі тры суботнікі ў колгасах: „Чырвоны Араты", „Чырвоны Барацьбіт" і „Памяці Ільліча". Суботнікі прашлі масава і арганізавана. У іх прыняло ўдзел каля 100 чалавек.

Сіламі брыгад убрана **6 га** жыта, скошана і зьвезена каля 1000 пудоў канюшыны і сена. Дзякуючы дапамозе комсамольскіх ячэек і профсаюзных брыгад вышэй пералічаныя колгасы закончылі уборку і прыступілі да абмалоту і падрыхтоўкі да асеньня-пасеўнай кампаніі.

П. Бекішаў.

Працоўныя м-ка Любань дапамагаюць уборцы

Любаньская местачковая ячэйка (Бабруйшчына) з паходам уборачнай абвясьціла сябе ўдарнай і прапрацавала ў падшэфным колгасе тры дні. Прыкладу комсамольскай ячэйкі пасьледвалі профсаюзы, якія арганізавалі 10 ударных брыгад з колькасьцю 211 чалавек. Брыгады былі кінуты ў 10 колгасаў, дзе прапрацавалі па 3-4 дні.

Брыгады аказалі вялікую дапамогу колгасам ва ўборцы дзесяткаў га сена, канюшыны і жыта.

Акрамя гэтага была праведзена вялікая арганізацыйная работа сярод індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па пытаньню колектывізацыі, пасьля чаго ў некаторых колгасах пачаўся прыліў апошніх. Ячэйка арганізавала таксама брыгады для дапамогі індывідуальным бядняцкім гаспадаркам па ўборцы ўраджаю.

Казарэйс.

Уборка ўраджаю ў колгасе „Прамень Социялізму", Самахвалаўшчына

Дапамаглі колгасам убраць жыта і сена

Праца па ўборцы ўраджаю ў колгасах Прапойскага р. (Магілеўшчына) разгарнулася ва ўсю шырыню. Многія колгасы адчуваюць вялікі недахоп у рабочай сіле. На дапамогу прышлі партыйныя, профэсыйныя і комсамольскія арганізацыі раёну. У колгасы былі пасланы ўдарныя брыгады з комсамольцаў і сяброў профэсыйных саюзаў. Так, у колгас „Комунар" былі пасланы 30 чалавек, у „Беларускую Вёску"—30, у „Ленінец"—104 і ў „Акцябр"—40. У апошнім колгасе брыгада складалася выключна з комсамольцаў Нова-Слабодзкай і профсаюзнай ячэйкі.

Саматужна-прамысловая арцель вылучыла брыгаду з трох кавалёў, якія аб'яжджаюць усе колгасы і рамантуюць інвэнтар. Брыгада комсамольцаў і сяброў саюзаў разгарнулі социялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва на колгасных палёх. Дзякуючы іх дапамозе колгасы сваечасова ўбралі жыта і сена.

Левін.

Па-баявому сустрэнем асеньнюю сяўбу

Комсамольская ячэйка пры колгасе «Чырвоны Араты» пастанавіла: абвясьціць сябе ўдарнай на ўвесь час уборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы. Для праверкі работы кожнага комсамольца ўпаасобку, парашылі кожныя два дні слухаць індывідуальную справаздачу комсамольцаў аб удзеле іх у працы колгасу. Вылучылі брыгаду з трох комсамольцаў, якія павінны сваечасова падрыхтаваць увесь сельска-гаспадарчы інвэнтар да асеньняй сяўбы. Уся ячэйка падпісалася на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады" на суму 5-дзённа а заробку кожнага.

ПАДАБЕД.

Уборку жыта закончылі

Колгас імя ЦВК БССР, Плешчаніцкага р-ну (Меншчына), шырока абгаварыў пляны асеньня-пасеўнай кампаніі і ўборкі ўраджаю.

Усе колгасьнікі і колгасьніцы абвясьцілі сябе ўдарнікамі па правядзеньню гэтых кампаній і адмовіліся ад выхадных дзён.

Дзякуючы ўдарніцтву, 2-га жніўня колгас закончыў уборку жыта і да 5-га жніўня на палову закончыў уборку сенажаці.

Колгас заключыў социялістычнае спаборніцтва з другім колгасам свайго сельсавету.

Шабан Васіль.

Комсамольскі энтузіязм на колгасных палёх

Бялыніцкая арганізацыя комсамолу добра арганізавала працу па ўборцы ўраджаю. Ячэйкі комсамолу пры колгасах усе разьбіты на брыгады па асобных галінах працы. РК комсамолу арганізаваў раённую брыгаду з 18 комсамольцаў, якія працуюць у колгасных ячэйках.

Усе колгасныя ячэйкі ўступілі паміж сабой у соцспаборніцтва на лепшае і датэрміновае правядзеньне ўборкі ўраджаю. Адбыўшыйся зьлёт колгаснай моладзі абвясьціў сябе ўдарным, правядзеньні ўборачнай кампаніі. Арганізаваны шэраг масавых суботнікаў, якія працавалі на колгасных колёнах. Да ўдзелу ў працы суботнікаў прыцягнуты піонэры і служачыя раённых установ, якія працуюць у час свайго адпачынку. Па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі арганізаваны завочныя курсы колгасьнікаў, утворана дзіцячая пляцоўка. Праз суботнікі зьбіраюцца грошы на набыцьцё радыё. Арганізаваны брыгады з комсамольцаў па рэалізацыі пазыкі „5-годку ў 4 гады".

Пятроўскі С.

Падрыхтоўка да асеньняга севу праходзіць марудна

Плешчаніцы 15. (Ад нашага юнвяскора). Падрыхтоўка да асеньняга севу ў Плешчаніцкім раёне праходзіць надзвычайна марудна. Зямля яшчэ не ва ўсіх колгасах падрыхтавана, бо ў большай частцы колгасаў збожжа яшчэ знаходзіцца на палёх. Машынамі колгасы забясьпечаны. У райколгасе валяецца лішніх машын на 50.000 рублёў. Індывідуальны сэктар да асеньняй сяўбы не падрыхтаваны. Сярод індывідуальнікаў не вядзецца ніякай працы. Райколгассаюз мае 4 інструктароў, якія нічога ня робяць у падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы.

Гельфман.

Уборку сенажаці і жыта закончылі

Дзякуючы творчаму энтузіязму колгасьнікаў колгас „Новы Шлях" пасьпяхова закончыў уборку сенажаці і жыта. Зараз прыступіў да ўборкі яравых.

Р. Малаток.

Датэрміновая здача падатку

Плешчаніцы, 14 (Ад нашага кор.). Па Плешчаніцкім раёне пачалася датэрміновая здача падатку. Ужо здана каля 1.300 рублёў. Уперадзе ідзе Крайскі сельсавет.

Гельфман.

Дзесяцідзёнкай даб'емся 100 пр[оц.] ахопу пазыкай пролетарскага Менск[у]

Бліжэйшыя дні зьяўляюцца рашаючымі ва ўсёй кампаніі па пазыцы „5-цігодка ў чатыры гады".

Набліжаецца 1-ае верасьня. Да гэтага тэрміну ў горадзе колектыўныя падпішчыкі павінны пачаць свае першыя ўзносы па пазыцы.

Для забясьпечаньня фінансавага пляну социялістычнага будаўніцтва г. г. неабходна, каб гэты тэрмін першага ўзносу быў абавязкова выкананы.

Трэба мець на ўвазе адказнасьць ня толькі за правядзеньне папярэдняй падпіскі на пазыку, але і па яе афармленьню і арганізацыі поўнага і сваечасовага ўтрыманьня ўзносаў.

З мэтай пасьпяховага правядзеньня кампаніі і сваечасовага ахопу рабочых і служачых пазыкай Менгарсавет абвясьціў дзесяцідзёнку на 100 проц. ахопу рабочых і служачых пазыкай 2-хтыднёвага заработку і выклікаў на спаборніцтва Віцебскі і Гомельскі Гарсаветы.

Ударная 10-цідзёнка ставіць перад камсадамі ФЗМ і парт'ячэйкамі цэлы шэраг адказных задач па пасьпяховаму правядзеньню кампаніі.

Камісіі садзейнічаньня проф. і парт. ячэек прадпрыемстваў і ўстаноў павінны ў першую чаргу безадкладна аформіць сваю папярэднюю падпіску з такім разьлікам, каб 1-шы ўзнос утрымаць ні ў якім разе не пазьней 10-IX—30 г.

Камсады павінны перадаць усе падпісныя лісты сваёй адміністрацыі, якая аформіць сваю падпіску праз тыя крэдытныя ўстановы, да якой яны прымацаваны.

Побач з гэтым, трэба максымальна разгарнуць самую напружаную працу, як растл мачальную так і па далейшаму ахопу рабочых і служачых пазыкай. Працу па ахопу пазыкай трэба правесьці ва ўдарным парадку з тым, каб у працягу абвешчанай 10-ці дзёнкі заданьне па 100 пр. ахопу рабочых і служачых пазыкай было цалкам выканана.

Разам з ударнай працай па ахопу пазыкай рабочых і служачых неабходна таксама зьвярнуць адпаведную ўвагу на забыты ўсімі адказны вучастак працы, гэта на разьмяшчэньне пазыкі сярод неарганізаванага насельніцтва гораду: саматужнікаў адзінак, асоб вольных профэсій, жыхароў Жактаў і г. д. На гэтую частку насельніцтва па кантрольных лічбах г. Менску прыпадае 20000 руб[...] між тым падпіска праходзіць [...] марудна. Неабходна зараз-жа р[...]нуць працу сярод неарганіза[...] насельніцтва, раскачаць камса[...] целяй і Жактаў, практычна ўц[...] чы іх у разьмяшчэньне пазыкі.

Ударную дзесяцідзёнку [...] камсады, ФЗМ і парт. ячэйкі [...]ны скарыстаць яшчэ ў сэнсе пр[...]кі ходу спаборніцтва, праверкі [...]наньня прынятых на сябе спаб[...]твам абавязацельстваў. Органі[...] гэткай праверкі, вынясеньне [...] яе на шырокія сходы рабочых і [...]жачых, на старонкі друку і на[...] газэт, падцягнуць камсады і [...] выпрастаюць іх слабыя месцы [...]цы і прымусяць прыняць тэрмі[...] меры да выкананьня і перавык[...]ня кантрольных лічбаў.

Побач з максымальным разгор[...]нем працы нізавых камсадаў, [...] агенты з свайго боку павінны [...]ма скарыстаць 10-ці днёўку дл[...] веркі ходу кампаніі па сваіх [...]тывах, для практычнай дапам[...] пераносцы рэалізацыі пазыкі на соц. спаборніцтва, для найхутч[...] і поўнага ахопу пазыкай сваіх [...]тываў, для найлепшага і сыстэ[...]нага інструктаваньня камсадаў, [...]даючы і дапамагаючы камісіі [...]нічаньня ў яе штодзённай пра[...]

Адказнасьць сучаснага этапу п[...]вай кампаніі патрабуе больш [...]ненай увагі да яе з боку ўсіх [...]кіх, партыйных і грамадзкіх ор[...]цый. Менгарсавет адзначае [...] значэньне пасьпяховасьці пра[...]ня кампаніі па рэалізацыі пазы[...] „[пя]цігодка—у чатыры гады" і [...] ФЗМ, камсады, партыйныя, [...] і грамадзкія арганізацыі пры[...]мы актыўнейшы і гарачы ў[...] правядзеньні абвешчанай 10-ці[...]

Уся праца па рэалізацыі паз[...] вінна быць праведзена пад 100 проц. ахопу рабочых і слу[...] пазыкай за 10 дзён.

20 жніўня не павінна быць [...]нага рабочага і служачага [...] Менску без пазыкі.

Не пазьней 1 верасьня г. г. [...]ны паступіць у дзяржаўныя першыя ўзносы.

У спаборніцтве па правя[...] дзесяцідзёнкі Менск павінен [...] першае месца.

Менгарсавет і гарк[...]

Будвуч не падрыхтаваны

Няма падсобнай рабочай сілы, але гэта яшчэ ня значыць, што вучні, якія атрымоўваюць кваліфікацыю (бэтонна-арматурны цэх Будвучу), павінны быць чорнарабочымі. Аб гэтым ня раз пісалася ў насьценгазэце, але мабыць напляваць на ле загадчыку Шлёзбэргу. Вучняў прымушаюць капаць ямы, цягаць цяжкія жалезныя масы, варштаты формы для сходаў.

Адміністрацыі гаварылі аб гэтым, але загадчык Шлёзбэрг не зьвяртае ўвагі. Мы пытаемся: «Нашто мы губляем каштоўны час? Пройдуць два гады нашай вучобы і мы выйдзем чорнарабочымі. Загадчыку гаварылі аб тым, што спосаб рэзкі жалеза нягодны, ён абяцаў палепшыць гэтую справу, бо трэба ўстанавіць машынкі для рэзкі дроў. Але ён не дае балтоў. Тоўстае жалеза рубяць зубілам, а Шлёзбэрг абяцае прывезьці машыну.

Тав. Шлёзбэрга папераджалі, што пры спосабе рубкі зубілам можна пакалечыцца, але на гэта не зьвярнулі ўвагі. У выніку вучань Шаховіч пакалечыўся і ня можа прыходзіць на працу.

У „Чырвонай Зьмене" за 4-ае жніўня была зьмешчана заметка аб тым, як у Менскім Будвучы правод[...]віцца вылучэньне інструкт[...] самых вучняў. У гэтым допі[...]салася аб тым, што загадчык [...] вучу без усякага абгавар[...] вылучыў некалькіх вучняў [...] сталі інструктарамі. Бяз[...] хлопцы, якія прапрацавалі кароткі час, ні ў якім разе [...]гуць справіцца з гэтай прац[...] і самі ня могуць навучыцца небудзь.

Усе гэтыя вылучэнцы адар[...] ад працы, напалову недаву[...] усіх абяцанак загадчык [...] толькі адну: павысіў ім раз[...] больш нічога.

Нам невядома, чаму гэта [...]страцыя Белдзяржбуду ня [...] належных захадаў, каб забясь[...] Будвуч сапраўднымі інстру[...] якія маглі-б перадаць свой [...] вучням, а займаецца вылуч[...] якое толькі дрэнна адбіваецц[...] на вучнёўстве, так і на гэт[...]мых вылучэнцах. Акрамя т[...]дучыя наборы ў Будвуч [...] усім пад пагрозай зрыву, [...]кая тактыка вылучэньня ня [...] зьнішчана і не ўвядуць са[...] падрыхтаваных кваліфікава[...] строў. Гэтым пытаньнем тр[...] мінавазаняцца.

С. Крытыкоў

Дэзэртыр з фронту колектывізацыі

У Бягомльскі раён (Меншчына) для дапамогі комсамольскім [...]кам у правядзеньні сілосаваньня і ўборкі ўраджаю быў прысланы [...]гадзір АК ЛКСМБ тав. Сіняков.

Прыехаўшы на месца, ён замест працы па складаньню [...] ўборачнай кампаніі ў колгасах пачаў пісаць, як ён казаў, „драм[...] жыцьця колгасаў і праз тры дні ўцёк у Менск.

Паштовая скрынка

Каралю—„Без няшчак і цацак", Шванкову—„Уборачную сустракаем падрыхтаваныя", Некрашэвічу—„За інтэрнацыянальнае выхаваньне колгаснай моладзі", Лосю—„Скрыўленьне генэральнай лініі партыі", Сьліва—„Працаваюць скрыўляць генэральную лінію", Зубу—„З такімі не да соцыялізму", Раленку—„Асобная установа", Невяроўскаму—„Мае хоць якія, але вынікі", Кашавалаву—„Наш [...]" Архіпаву—„Раздробленасьць" [...]лічаныя вышэй допісы ня [...] з-за адсутнасьці дакладных [...]голага асьвятленьня самых [...] фактаў.

Адказны рэдактар [...] Рэдкол[...]

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599